# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

БДУ

21 лістапада 2002 года, чацвер, № 15 (1863)


ФОТАПОЗІРК



## Дзверы хутка адчыняць






У ваход у галоўны корпус БДУ з плошчы Незалежнасці ўжо некалькі месяцаў як закрыты. Ідзе рэканструкцыя плошчы. Супрацоўнікі і студэнты з нецярплівасцю чакаюць, калі адбудуцца змены на пляцоўцы перад універсітэтам. І вось прыемная навіна: галоўныя дзверы хутка павінны быць адчынены. Будаўнікі абяцаюць, што 1 снежня... Пачакаем?

*Мікалай ГРАДЗЮШКА, студэнт II курса факультэта журналістыкі*

*Фота аўтара*




КУРСЫ

## Навучальна-адукацыйная ўстанова БДУ "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"

КАФЕДРА КІРАВАННЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ І КАФЕДРА ЮНЕСКА КУЛЬТУРЫ СВЕТУ І ДЭМАКРАТЫІ

*запрашае на курсы перападрыхтоўкі па спецыяльнасці "Менеджмент у сферы адукацыі" са спецыялізацыяй "Кіраванне вышэйшай школай"*

Для фармавання эфектыўнай сістэмы навучання і выхавання, укаранення стройнай сістэмы зместу і тэхналогій навучання і выхавання ў вышэйшай школе неабходныя прафесійныя кіраўнікі. У краіне іх не рыхтуюць, і "даспяваюць" яны метадам "спроб і памылак". Закрыць гэты прабел пакліканыя двухгадовыя курсы перападрыхтоўкі на базе вышэйшай адукацыі без адрыву ад працы.

Змест распрацаванай навучальна-метадычнай дакументацыі накіраваны на фармаванне кіраўнічай і псіхалагічна-педагагічнай культуры кіраўніка ВНУ з уключэннем кампанента сацыяльна-эканамічнай і гуманітарнай падрыхтоўкі.

Навучальны план уключае дысцыпліны з галіны эканомікі адукацыі, менеджменту сучасных праблем вышэйшай школы, псіхалогіі кіравання, public relations і г.д.

У курсаў — выяўленая практычная накіраванасць. Выкарыстанне актыўных формаў і метадаў навучання, педагагічных інавацый дазволіць сфармаваць у слухачоў канкрэтныя навыкі і ўмельствы, неабходныя для сучаснага кіраўніка ў сістэме вышэйшай школы.

Выкладанне забяспечвае высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі састаў РІВШ БДУ і БДУ, спецыялісты якога прайшлі стажыроўку ў вядучых навукова-адукацыйных цэнтрах свету, а таксама кіраўнікі і вядучыя спецыялісты Міністэрства адукацыі Беларусі, іншых міністэрстваў і ведамстваў, замежныя спецыялісты.

Выпускнікі курсаў атрымліваюць дыплом аб перападрыхтоўцы з наданнем кваліфікацыі "Менеджэр у сферы адукацыі".

Навучанне бясплатнае для асобаў, якія маюць накіраванне ад установаў Міністэрства адукацыі Беларусі і паспяхова прайшлі сумоўе. У іншых выпадках прапануецца платнае навучанне. Іншагароднім слухачам прадастаўляецца інтэрнат, размешчаны ў будынку інстытута (для засялення неабходны пашпарт і камандзіровачнае пасведчанне, камандзіровачныя выдаткі — за кошт камандзіруючай арганізацыі, кошт пражывання ў кошт навучання не ўключаецца).

Заняткі адбываюцца па 5 сесій у год, кожная працягласцю 1 месяц па 6 дзён на тыдзень (другая палова дня).

Тэрмін падачы дакументаў — да 15 студзеня 2003 г. Пачатак заняткаў — 27 студзеня 2003 г.

*Пералік дакументаў:*

пашпарт (прад'яўляецца);

заява спецыяліста на імя рэктара РІВШ БДУ;

накіраванне з месца працы на імя рэктара РІВШ БДУ;

асабісты лісток па ўліку кадраў, завераны па месцы працы;

копіі дыплома аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы і дадатку (выпіскі з заліковай ведамасці, арыгіналы прад'яўляюцца асабіста);

фота 3х4 см.

Колькасць слухачоў абмежаваная!

*Дакументы прымаюцца па адрасе: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Навучальна-адукацыйная ўстанова БДУ "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы", пакой 626 (9.00—12.30 і 14.00—16.00).*

*Тэлефон для даведак і папярэдняга запісу (0-17)222-83-10.*

*E-mail: gancher@nihe.niks.by*

ЮБІЛЕІ

# Інтэрнату № 1 — 50 гадоў!

Ужо 50 гадоў інтэрнат № 1 нашага універсітэта гасцінна адчыняе свае дзверы студэнтам гістарычнага факультэта. 7 лістапада яму якраз споўнілася паўстагоддзя.

Ён нездарма першы, гэты інтэрнат. Сваім часам тут жылі першы чалавек у Міністэрстве адукацыі П.І. Брыгадзін, першы прарэктар БДУ А.А. Яноўскі, першы чалавек на гістфаку (дэкан) С.М. Ходзін, а таксама шмат іншых вартых людзей. Той-сёй з гэтых вартых, жыхары і супрацоўнікі студэнцкага гарадка БДУ, а таксама журналісты і проста цікаўныя сабраліся 24 кастрычніка ў сталоўцы інтэрната № 5, каб павіншаваць "імяніннікa" з юбілеем. Варта зазначыць, што канцэрт, які падрыхтавалі актывісты інтэрната, атрымаўся выдатны — адміністрацыі і жыхарам "капейкі" ён вельмі спадабаўся.

Вядучыя Уладзіслаў Рэвут і Дзяніс Кісялёў — тыя самыя актывісты — у арыгінальнай форме распавялі гасцям гісторыю двух закаханых — Яе і Яго. Хто гэтыя двое — яны хавалі да апошняга. Высветлілася, што гэта інтэрнат № 1 і гістарычны факультэт. Паралельна з юбілеем нявесты ("капеечкі") "салодкая парачка" адзначала сваё залатое вяселле. Двайное свята ўдалося, чаму нямала паспрыялі студэнцкія актывісты інтэрнатаў. Арыгінальныя казкі, перароблены на новы лад, музычныя нумары, конкурсы, пароды, танец гурта "Non Stop" — усё гэта прыемна здзівіла гасцей. Ну, а велізарны каравай, які дзялілі сваты і "маладога" і "маладой", яшчэ больш прыўзняў і так святочны настрой. Пагатоў, пакаштаваць яго змаглі ўсе ахвотныя. Паболей бы такіх шыкоўных святаў, смачных караваеў і шчодрых спонсараў (як завод "Аліварыя"). Вялізны дзякуй рэктарату БДУ за падарункі да юбілею — тэлевізар і музычны цэнтр.

*Юлія ЛАЗАР,*
*Кацярына ЛОБАЧ*






МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Беларуска-брытанскі праект REAR

Каб прымаць эфектыўныя рашэнні ў эканоміцы і бізнесе, неабходны глыбокі аналіз бягучага стану працэсаў і прагназаванне тэндэнцый іх зменаў у будучыні. Неабходны інструментарый для гэтага прадастаўляе эканаметрыка. Веды ў гэтай галіне неабходныя эканамістам-аналітыкам высокай кваліфікацыі. Патрэбу ў такіх спецыялістах адчуваюць як дзяржаўныя арганізацыі (міністэрствы эканомікі, фінансаў, Нацыянальны банк), так і камерцыйныя структуры (камерцыйныя банкі, фінансавыя, інвестыцыйныя і страхавыя кампаніі).

Курс "эканаметрыка" параўнаўча нядаўна ўвайшоў у навучальныя планы эканамічных спецыяльнасцяў беларускіх і расійскіх універсітэтаў. Таму ён яшчэ не дастаткова добра забяспечаны навучальна-метадычнай літаратурай. Актуальнымі застаюцца і пытанні, звязаныя з удасканаленнем навучальных праграм як па эканаметрыцы, так і па звязаных з ёй курсах. Аднак асаблівую актуальнасць мае праблема распрацоўкі камп'ютарных практыкумаў, якія суправаджаюць лекцыйны курс, а таксама адпаведных навучальна-метадычных матэрыялаў. Гэтыя праблемы закліка용 вырашыць праект REAR (Regional Academic Partnership Scheme) BEL/395/41/007, які фінансуецца Дэпартаментам міжнароднага развіцця Брытанскай Рады. Праект выконваецца з верасня 1999 года кафедрай матэматычнага мадэліравання і аналізу даных факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ разам з Манчэстэрскім універсітэтам Метраполітан.

Распрацоўка праекта вядзецца па трох асноўных накірунках:

1) распрацоўка і ўкараненне навучальных праграмаў, курсаў лекцыяў і камп'ютарных практыкумаў;

2) падрыхтоўка навучальных дапаможнікаў;

3) апрабацыя і распаўсюджванне вынікаў праекта.

У рамках першага накірунку распрацаваны, афіцыйна зацверджаны і апублікаваны ў якасці базавых праграм па эканамічнай кібернетыцы праграмы па такіх курсах, як эканаметрыка, матэматычнае прагназаванне, мадэліраванне фінансавага рынку. Мадэрнізавана праграма курса лекцыяў "Рынак каштоўных папераў". Усе распрацаваныя курсы і спадарожныя ім камп'ютарныя практыкумы былі ўведзены ў навучальны працэс у БДУ на працягу 2000/2001 навучальнага года.

У адпаведнасці з планам работ па праекце падрыхтаваны два новыя навучальныя дапаможнікі:

*Малюгин В.И. "Рынок ценных бумаг: количественные методы анализа";*

*Харин Ю.С., Малюгин В.И., Харин А.Ю. "Компьютерный практикум по эконометрическому моделированию, анализу и прогнозированию".*

Першы навучальны дапаможнік выйшаў у 2001 годзе ў Выдавецкім цэнтры БДУ. Ён дапушчаны Міністэрствам адукацыі Беларусі ў якасці навучальнага дапаможніка для студэнтаў спецыяльнасцяў "Эканамічная кібернетыка" і "Актуарная матэматыка" ВНУ. Другі навучальны дапаможнік павінен з'явіцца ў 2003 годзе. Гэтыя навучальныя дапаможнікі служаць тэарэтычнай і метадалагічнай асновай для распрацоўкі лекцыйных курсаў і камп'ютарных практыкумаў па ўказаных дысцыплінах.

Праграмным забеспячэннем камп'ютарных практыкумаў служаць распрацаваныя на кафедры матэматычнага мадэліравання і аналізу даных пакет прыкладных праграм СЭМП ("Сістэма эканаметрычнага мадэліравання і прагназавання") і "Камп'ютарны падручнік па статыстыцы".

Вынікі праекта былі прадстаўлены на спецыяльна арганізаваным Рэспубліканскім навукова-метадычным семінары "Арганізацыя, навучальна-метадычнае і праграмнае забеспячэнне курсаў лекцыяў і камп'ютарных практыкумаў па эканаметрыцы, статыстыцы і колькасных метадах фінансавага аналізу" (16—17 кастрычніка 2002 г.). Удзельнікі семінара, а таксама эксперты і партнёры з Вялікабрытаніі высока ацанілі прадстаўленыя на семінары распрацоўкі і рэкамендавалі іх да больш шырокага распаўсюджвання.

Праект блізіцца да заканчэння, аднак супрацоўніцтва з Манчэстэрскім універсітэтам Метраполітан не скончыцца. Вынікам нядаўняга візіта ў наш універсітэт прарэктара МУМ, дэкана Школы бізнесу прафесара Найджэла Хіла стала падпісанне Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Школай бізнесу МУМ і спецыяльным факультэтам бізнесу і інфармацыйных тэхналогій БДУ.

*Ю.С. ХАРЫН,*
*У.І. МАЛЮГІН*

ПАДАРОЖЖЫ

# На Коласавым шляху

*Дойдзіцца добрая традыцыя нашага студэнцкага гарадка — «Маршрут выхаднога дня». 26 кастрычніка ў рамках гэтай праграмы адбылася чарговая паездка, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа: студэнцкі актыў пабываў на радзіме паэта.*

"Шлях Коласа" — так называецца мемарыяльна-мастацкі комплекс, які знітоўвае ў адно памятныя Коласавы мясціны — Смольню, Акінчыцы, Альбуць і Ластак. Нам давялося ўбачыць амаль усю гэту прыгажосць на свае вочы. Напэўна, і гаварыць не трэба, як мы былі здзіўлены: прайшло столькі гадоў, а ўсё, што апісваў Колас у сваіх творах, паўстала перад намі амаль такім самым.

Пачалася наша экскурсія ў Акінчыцах — месцы, дзе паэт нарадзіўся. Да 100-гадовага юбілею Якуба Коласа Акінчыцкая лясная камора была адноўлена згодна з архіўнымі дакументамі: хата ў гладкі вугал, крытая гонтам, гумно з аборай пад саламянай страхою, студня. Сярод хатніх рэчаў, якімі карысталася сям'я Міцкевічаў, увагу прыцягвае калыска, дзе малы Кастусь слухаў матчыны калыханкі... Ад усяго павявала нейкай нерэальнасцю і загадкавасцю.

Далей мы пайшлі па "шляху Коласа" да Альбуці. Больш за 40 драўляных скульптур па матывах твораў паэта, зробленых народнымі ўмельцамі-разьбярамі, стаяць уздоўж дорогі Акінчыцы—Альбуць. Тут можна ўбачыць і дзядзьку Антося, які ловіць рыбу, і бацьку Коласа — Міхала Міцкевіча. На вялізных валунах павысяканы цытаты з "Новай зямлі", а вакол — векавечныя дубы.



Парэчча — слаўная мясціна,
Куток прыгожы і вясёлы.
Як мора — лес, як неба — долы,
Зіхціць у кветках лугавіна.

Альбуць — музей "Новай зямлі"(у паэме назва заменена на Парэчча). Здавалася, гаспадары зусім ненадоўга пакінулі сядзібу, у хуткім часе хата напоўніцца галасамі дзяцей, на падворку пачне гаспадарыць дзядзька Антось... Але час бязлітасны: многага ўжо няма. Буран знішчыў ліпу ля хаты, ды ўсё ж яе камель — сімвал памяці! — пусціў парасткі, і летам, напэўна, маладыя галінкі шапацяць лісцем, сцвярджаючы вечнасць жыцця на зямлі.




Развітаўшыся з радзімай беларускага песняра, мы накіраваліся спачатку ў Мірскі замак, а потым — у Нясвіж. Задаволеныя, пад вялікім уражаннем мы вярнуліся ў родны горад.

*Кацярына ЛОБАЧ,*
*Юлія ЛАЗАР*

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# Адаптацыя першакурснікаў



Педагагічны семінар-практыкум "Адаптацыя студэнтаў першага курса да новых сацыяльных умоваў" адбыўся 5 лістапада ў інтэрнаце № 6. У працы семінара прымалі ўдзел намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце А.С. Невар, начальнік псіхалагічнай службы Р.П. Папок, начальнік Метадычнага цэнтра В.В. Якжык, педагагічныя работнікі інтэрнатаў. Былі заслуханыя даклады Р.П. Папка аб асноўных умовах прагрэсіўнай адаптацыі студэнтаў-першакурснікаў, В.В. Якжыка — аб аспектах сацыяльнай адаптацыі першакурснікаў ва ўмовах інтэрната, Л.В. Гулько — аб асаблівасцях адаптацыі замежных студэнтаў да ўмоваў пражывання ў інтэрнатах. Праца семінара працягвалася ў секцыях па асноўных накірунках дзейнасці студэнцкага гарадка. Вынікам семінара сталі выпрацаваныя практычныя рэкамендацыі па павышэнні эфектыўнасці працэсу адаптацыі студэнтаў першага курса.

ДЛЯ ЦЯБЕ

*Калі прымаўся Калектыўны дагавор паміж прафсаюзнай арганізацыяй БДУ і адміністрацыяй універсітэта, было прынята Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў структурных падраздзяленняў БДУ. Па просьбе чытачоў «Беларускага універсітэта» са згоды прафсаюзнага камітэта мы вырашылі надрукаваць яго ў нашай газеце.*

*Дадатак 1*
*да Калектыўнага дагавору*

# ПАЛАЖЭННЕ

## Аб матэрыяльным стымуляванні працы работнікаў структурных падраздзяленняў Белдзяржуніверсітэта

**І. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ.**

1.1. Палажэнне аб прэміраванні і ўстанаўленні надбавак да службовых акладаў работнікам БДУ ўводзіцца з мэтай матэрыяльнай зацікаўленасці іх у павышэнні эфектыўнасці працы, удасканальванні і дыферэнцыяцыі матэрыяльнага стымулявання. Распаўсюджваецца на работнікаў усіх структурных падраздзяленняў універсітэта, паводле Статута БДУ.

1.2. Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановамі Савета Міністраў і Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь, якія рэгламентуюць пытанні матэрыяльнага стымулявання працы работнікаў вышэйшых навучальных устаноў.

1.3. Крыніцамі сродкаў, якія накіроўваюцца на матэрыяльнае стымуляванне працы работнікаў універсітэта, з'яўляюцца сродкі рэспубліканскага бюджэту (50 % фонду заработнай платы), сродкі ад пазабюджэтнай і гаспадарчай дзейнасці і іншыя фінансавыя крыніцы.

1.4. На матэрыяльнае стымуляванне працы работнікаў універсітэта кожнаму структурнаму падраздзяленню зацвярджаецца штомесячны фонд.

Надбаўкі да службовых акладаў і прэміі работнікам БДУ ўлічваюцца пры налічэнні сярэдняга заробку ў выпадках і парадку, прадугледжаным дзейным заканадаўствам.

1.5. Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні зацвярджаецца рэктарам БДУ па ўзгадненні з прафсаюзным камітэтам.

**ІІ. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ЎСТАНАЎЛЕННЯ НАДБАВАК ДА СЛУЖБОВЫХ АКЛАДАЎ.**

2.1. Работнікам БДУ ўстанаўліваюцца наступныя віды надбавак да службовых акладаў:

2.1.1. Кіраўнікам, спецыялістам і службоўцам:

— за творчыя дасягненні ў рабоце, якія запатрабавалі рашэння прынцыпова новых задач, прымянення наватарскіх падыходаў, формаў і метадаў працы;

— за актыўную работу, якая вызначае перспектыву развіцця універсітэта;

— за вытворчыя дасягненні, якія забяспечылі ўстойлівае функцыянаванне і развіццё ВНУ, яе структурных падраздзяленняў, якасць і аператыўнасць выканання службовых абавязкаў, ажыццяўленне падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасці з прад'яўленымі дзяржавай патрабаваннямі;

— за плённую падрыхтоўку кандыдатаў і дактароў навук пры паспяховым заканчэнні аспірантуры, за арганізацыю павышэння прафесійнай кваліфікацыі кадраў;

— за работу па навукова-метадычным забеспячэнні навучальнага працэсу, распрацоўку навучальных і метадычных дапаможнікаў, за ўдзел у камп'ютарызацыі, укараненне новых адукацыйных тэхналогій у навучальны працэс;

— за абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта, забеспячэнне захаванасці матэрыяльных каштоўнасцяў, эканомію электра- і цеплаэнергіі, паляпшэнне ўмоваў працы супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта;

— за выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ, не прадугледжаных службовымі абавязкамі работнікаў на перыяд выканання, але не больш за бягучы год, надзвычайных пазапланавых работ па выкананні тэрміновых даручэнняў кіраўніцтва універсітэта, што запатрабавалі ад выканаўцаў высокага прафесійнага майстэрства і асаблівых творчых намаганняў, дадатковых затратаў часу і павышанай інтэнсіўнасці працы на перыяд іх выканання.

2.1.2. Рабочым:

— за прафесійнае майстэрства: з мэтай стымулявання павышэння прафесійнага майстэрства і ўзмацнення матэрыяльнай зацікаўленасці і адказнасці за выкананне заданняў устанаўліваць дыферэнцыраваныя надбаўкі да тарыфных ставак:

для 3-га разраду — 12 %;
для 4-га разраду — 16 %;
для 5-га разраду — да 20 %;
для 6-га разраду — да 24 %.

2.2. Устанаўленне надбавак рэктару ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным вышэйстаячым органам кіравання.

Устанаўленне надбавак кіраўнікам цэнтраў, галоўных упраўленняў, упраўленняў, аддзелаў і іншых структурных падраздзяленняў, дэканам факультэтаў і загадчыкам агульнауніверсітэцкіх кафедраў адбываецца па прапанове курыруючых прарэктараў, а прарэктараў — рэктарам па ўзгадненні з прафсаюзным камітэтам Белдзяржуніверсітэта.

Прапановы аб устанаўленні надбавак заг. кафедраў, намеснікам дэканаў, выкладчыкам і работнікам факультэтаў прадстаўляюць дэканы факультэтаў па ўзгадненні з прафсаюзным бюро факультэта.

Прапановы аб устанаўленні надбавак работнікам цэнтраў, галоўных упраўленняў, упраўленняў, аддзелаў і іншых службаў прадстаўляюць кіраўнікі структурных падраздзяленняў разам з прафсаюзным бюро.

2.3. Падставай для ўстанаўлення работнікам надбавак можа быць высокая кваліфікацыя, плённасць працы, складанасць выканання ўскладзеных абавязкаў і задач, якія трэба рашыць, у планавым парадку.

2.4. Памер надбавак у працэнтах да службовых акладаў работнікаў, якія прапрацавалі не менш за адзін месяц, вызначаецца загадам рэктара БДУ.

2.5. Памер надбаўкі канкрэтнаму работніку не можа перавышаць яго службовага аклада. Устанаўленне надбавак ажыццяўляецца ў межах сродкаў, зацверджаных на матэрыяльнае стымуляванне.

2.6. Выплата надбавак адбываецца штомесяц, сыходзячы з вызначаных памераў, адначасова з заробкам.

2.7. Надбаўкі работнікам могуць быць адмененыя ці зменшаныя ў выпадку невыканання тэрмінаў заканчэння работ ці пры нізкай якасці выканання даручанай работы, пры парушэнні працоўнай і вытворчай дысцыпліны.

2.8. Надбаўкі не прызначаюцца за перыяды:

— чарговага адпачынку;

— часовай непрацаздольнасці;

— выпрабавальнага тэрміну;

— адпачынку без захавання заробку;

— творчых адпачынкаў;

— адпачынку па доглядзе за дзіцем да дасягнення ім узросту 3-х гадоў;

— знаходжання на курсах павышэння кваліфікацыі і іншыя перыяды, калі за супрацоўнікам у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам захоўваецца сярэдні заробак.

**ІІІ. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРЭМІРАВАННЯ.**

3.1. Прэміраванне работнікаў адбываецца за наступныя паказчыкі:

— высокая якасць і эфектыўнасць выкананых работ;

— выкананне даручанай работы датэрмінова і якасна;

— спрыянне ўводу ў дзеянне аб'ектаў будоўлі;

— укараненне ў практыку новых формаў і метадаў арганізацыі працы;

— абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы і забеспячэнне захаванасці матэрыяльных каштоўнасцяў;

— работу па навукова-метадычным забеспячэнні навучальнага працэсу, распрацоўцы навучальных і метадычных дапаможнікаў;

— своечасовае і якаснае выкананне заданняў на правядзенне навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ і дамоваў (кантрактаў) на стварэнне (перадачу) навукова-тэхнічнай прадукцыі;

— спрыянне своечасоваму і якаснаму выкананню НДДКР;

— паспяховае завяршэнне ў тэрмін найбольш актуальных навукова-даследчых работ;

— паспяховую працу па ўкараненні вынікаў навукова-даследчых работ;

— плённую арганізацыйную і інфармацыйна-выхаваўчую работу са студэнтамі, аспірантамі;

— актыўную эфектыўную прафарыентацыйную працу з моладдзю.

Паказчыкі прэміравання для асобных структурных падраздзяленняў і асобных катэгорый работнікаў вызначаюцца кіраўнікамі ў залежнасці ад ацэнкі выкананых работ, унесенага ўкладу ў дасягненне фінансавага выніку, ацэнкі якасці кіравання і абслугоўвання дзейнасці.

3.2. Прэміраванне рэктара ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным вышэйстаячым органам кіравання.

Прэміраванне кіраўнікоў цэнтраў, галоўных упраўленняў, упраўленняў, аддзелаў і іншых структурных падраздзяленняў, дэканаў факультэтаў і загадчыкаў агульнауніверсітэцкіх кафедраў адбываецца па прапанове курыруючых прарэктараў, а прарэктараў — рэктарам па ўзгадненні з прафсаюзным камітэтам Белдзяржуніверсітэта.

Прапановы аб прэміраванні заг. кафедраў, намеснікаў дэканаў, выкладчыкаў і работнікаў факультэтаў прадстаўляюць дэканы факультэтаў па ўзгадненні з прафсаюзным бюро факультэта.

Прапановы аб прэміраванні работнікаў цэнтраў, галоўных упраўленняў, упраўленняў, аддзелаў і іншых службаў прадстаўляюць кіраўнікі структурных падраздзяленняў разам з прафсаюзным бюро.

3.3. Асабісты ўклад кіраўнікоў НДДКР вызначаецца кіраўнікамі тэм, кіраўнікоў тэм — кіраўнікамі навуковых падраздзяленняў, кіраўнікоў навуковых падраздзяленняў — кіраўніком НДЧ. Да прэміравання прадстаўляюцца работнікі НДЧ, якія прымалі непасрэдны ўдзел у выкананні работ па тэме, забяспечылі своечасовае і якаснае выкананне прызначаных заданняў і ўнеслі асабісты ўклад у канчатковы вынік па закончаных і прынятых у вызначаным парадку работах.

3.4. Падставай для прыняцця рашэння аб прэміраванні з'яўляецца:

— для работнікаў НДЧ, занятых выкананнем работ па канкрэтнай закончанай тэме:

а) акт прыёмачнай камісіі (прыёмачных выпрабаванняў доследных узораў);

б) акт прыёмкі—здачы выкананай працы;

в) пацвярджэнне бухгалтэрыі аб наяўным памеры сродкаў на прэміраванне;

г) прадстаўленне навуковага падраздзялення аб складзе работнікаў, якіх прэміруюць, і велічыні індывідуальных прэмій, падпісанае кіраўніком падраздзялення і кіраўніком тэмы.

— для работнікаў вытворча-дапаможных і кіраўнічых падраздзяленняў НДЧ:

а) своечасовае афармленне дакументацыі аб здачы і аплаце работ па этапах, у адпаведнасці з тэрмінамі, прадугледжанымі каляндарнымі планамі па тэмах НДДКР;

б) высокая якасць патэнтна-інфармацыйнага, матэрыяльна-тэхнічнага і фінансава-гаспадарчага абслугоўвання навуковай дзейнасці;

в) своечасовае кадравае забеспячэнне НДР;

г) наяўнасць эканоміі сродкаў на аплату працы, прадугледжаных каштарысам накладных выдаткаў і сродкаў фонду матэрыяльнага заахвочвання.

Прэміраванне адбываецца за вынікі працы ў месяцы (квартале), які скончыўся, у залежнасці ад крыніцаў прэміравання і на падставе загаду рэктара. Работнікі, якія звольніліся па ўласным жаданні, не адпрацаваўшы цэлы месяц, ці звольненыя па ініцыятыве кіраўніцтва, прэміраванню не падлягаюць.

Прэміраванне новапрынятых работнікаў можа адбывацца пачынаючы з другога месяца працы ў БДУ.

3.5. Памеры прэміі кожнага работніка, прадстаўленага да прэміравання, вызначаюцца ў межах выдзеленай сумы прэміяльных сродкаў (на падраздзяленне, работу, заданне) дыферэнцыравана з улікам асабістага ўкладу ў агульныя вынікі працы.

Прэміі канкрэтным работнікам з улікам аб'ёмаў і якасці выкананых работ максімальнымі памерамі не абмяжоўваюцца.

3.6. Па выніках навучальнага і каляндарнага года прэміраванне работнікаў адбываецца па выніках іх працы ў справаздачным перыядзе.

3.7. Рэктар універсітэта мае права цалкам пазбавіць прэміі за:

— прагул без паважнай прычыны;

— учыненне дысцыплінарнай правіннасці;

— з'яўленне на працы ў стане алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення, а таксама распіццё спіртных напояў, ужыванне наркатычных ці таксічных сродкаў на працоўным месцы і ў працоўны час;

— невыкананне абавязкаў па калектыўным дагаворы;

— невыкананне службовых абавязкаў, пацверджанае вынікамі праверак, кантролю;

— грубае парушэнне ахovы працы і тэхнікі бяспекі;

— парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь і лакальных прававых актаў БДУ.

3.8. Гэтае Палажэнне дзейнічае да ўвядзення новых умоваў аплаты працы работнікаў універсітэта, устанаўлення надбавак, даплат і іншых выплат стымулюючага характару і можа па неабходнасці ўдакладняцца.

*Рэктар Белдзяржуніверсітэта,*
*прафесар А.У. КАЗУЛІН*
*Старшыня прафкама,*
*дацэнт Я.П. ТУРОМША*

*Дадатак 2*
*да Калектыўнага дагавору*

# ПАЛАЖЭННЕ

## Аб парадку выкарыстання фонду матэрыяльнай дапамогі БДУ

1. Сродкі, якія выдзяляюцца на матэрыяльную дапамогу, выплочваюцца ў наступных выпадках:

— нараджэнне дзіцяці;

— вяселле;

— смерць супрацоўніка універсітэта ці блізкіх сваякоў;

— дапамога адзінокім маці і мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей без маці;

— дапамога шматдзетным сем'ям (3 і больш дзяцей);

— дапамога ў сувязі з доўгай хваробай (больш за месяц) і амбулаторным лячэннем работніка альбо яго дзяцей;

— выдзяленне пуцёўкі супрацоўніку ў санаторый, дом адпачынку ці прафілакторый за межамі Рэспублікі Беларусь.

2. Асабістая заява на матэрыяльную дапамогу з указаннем прычын падаецца на імя рэктара.

3. У асаблівых выпадках рэктар можа аказваць матэрыяльную дапамогу працуючым супрацоўнікам універсітэта, працуючым пенсіянерам, якія аформілі пенсію праз універсітэт, пры ўзнікненні інфляцыйных працэсаў, росце цэн на тавары першай неабходнасці і паслугі, без іх асабістага звароту.

4. У выпадку смерці супрацоўніка універсітэта рэктарат аплочвае рытуальныя паслугі (вянок, труна) і па магчымасці выдзяляе аўтатранспарт.

5. Пры абставінах, якія маюць форс-мажорны характар, а таксама ў выпадку крадзяжу, абрабавання, пажару і г.д. работнікам універсітэта аказваецца разавая дапамога.

*Рэктар Белдзяржуніверсітэта,*
*прафесар А.У. КАЗУЛІН*
*Старшыня прафкама,*
*дацэнт Я.П. ТУРОМША*

ПАСМІХНЕМСЯ!

# Студэнт, ты "захаваўся" перад сесіяй?

***

— Прафесар, а два балы за што?

— Адзін бал за тое, што вы прыйшлі на іспыт, другі — за спробу адказваць.

— А трэці —за тое, што я сыйду — вы накінуць не можаце?

***

Размова двух студэнтаў:

— Ты ўжо колькі іспытаў заваліў?

— Разам з заўтрашнім — пяць.

***

Дыялог на экзамене. Выкладчык:

— Што такое конская сіла?

— Гэта сіла, якую развівае конь ростам у адзін метр і вагой у адзін кілаграм.

— Дзе ж вы такога каня бачылі?

— А яго проста так не ўбачыш! Ён захоўваецца ў Парыжы, у Палаце мераў і вагаў.

***

Чарга ў студэнцкую сталоўку:

— Тры сасіскі, калі ласка.

Голас з чаргі:

— Жыруеш, сволач?

— І 16 відэльцаў.

***

Ноч перад экзаменам. У кватэры прафесара звініць тэлефон. Заспаны прафесар у раздражненні:

— Алё!

— Што, спіш, зараза?

— ?!

— А мы вучым!

***

Выкладчык — студэнту:

— Вы ў войску былі?

— Не, а што?

— Ды так, магу ўладкаваць.

***

«Даведнік-вызначальнік для студэнтаў усіх устаноў".

Калі яно зялёнае або торгаецца — гэта біялогія.

Калі смярдзіць — гэта хімія.

Калі не працуе, але жарэ масу энергіі — гэта фізіка.

Калі ўвогуле ні да чаго не падобнае — гэта эканоміка.

***

Памятка экзаментару: "Будзьце тактычным. Не паўтарайце пытанне, калі студэнт яго недачуў, а незаўважна пастарайцеся перавесці гутарку на іншую тэму".

***

Дыялог на іспыце:

— Ведаеш?

— Ведаю.

— Што ведаеш?

— Прадмет ведаю.

— Каторы?

— Каторы здаю.

— А які прадмет здаеш?

— Ну... Гэта вы ўжо прыдзіраецеся.

***

Надпіс у студэнцкай сталоўцы:

"Просьба да студэнтаў: не кідайце на падлогу рэшткі ежы — атруціліся ўжо дзве коткі".

***

Асаблівасць студэнцкай памяці: не ведаў, але прыгадаў.

***

— Паслухайце, — абураецца выкладчык, — я вам ужо трэці раз стаўлю тройку. Чаму вы не вучыцеся? Урэшце, ад вучобы яшчэ ніхто не паміраў.

— Я ведаю, — адказвае студэнт, — аднак лепш не рызыкаваць.

***

Выкладчык французскай мовы пытаецца ў студэнта:

— Як бы вы папрасілі ў Парыжы напіцца вады?

— Даруйце, прафесар, але які ж дурань у Парыжы п'е ваду?

***

Студэнт дзеля здачы сесіі ідзе на ўсё. Нават на экзамен.

***

— Прафесар, як вы ставіцеся да таго, што студэнткі ўжываюць касметыку?

— Вельмі добра. Гэтыя студэнткі не равуць, атрымаўшы кепскую адзнаку.

РАСКЛАД

# Аўтобус № 47: вуліца Кірава – філіял БДУ

*Многія студэнты БДУ, а таксама супрацоўнікі ўніверсітэта, каб дабрацца да філіяла БДУ ў Шчамысліцы, карыстаюцца аўтобусам № 47. Да ўвагі чытачоў «Беларускага ўніверсітэта» — расклад руху аўтобуса.*

**Аўтобус №47**
**ад прыпынку "Вуліца Кірава"**
*будні*
5.57
6.16, 6.34, 6.53
7.11, 7.30, 7.48
8.07, 8.25, 8.44
9.02, 9.28, 9.58
10.28, 10.58
11.23, 11.47
12.12, 12.37
13.01, 13.31
14.01, 14.31
15.01, 15.26, 15.51
16.15, 16.40
17.05, 17.29, 17.54
18.24
19.05, 19.42
20.20, 20.52
21.16, 21.40
22.05, 22.30, 22.54
23.19, 23.44
0.15

**ад філіяла БДУ**
*будні*
6.35, 6.54
7.12, 7.31, 7.49
8.08, 8.26, 8.45
9.03, 9.22, 9.40
10.06, 10.36
11.06, 11.36
12.01, 12.25, 12.50
13.15, 13.39
14.09, 14.39
15.09, 15.39
16.04, 16.29, 16.53
17.18, 17.43
18.07, 18.32
19.02, 19.43
20.20, 20.58
21.30, 21.54
22.18, 22.43
23.08, 23.32, 23.57
0.27, 0.53

**ад прыпынку "Вуліца Кірава"**
*субота*
5.57
6.22, 6.47
7.11, 7.36
8.01, 8.25, 8.50
9.26
10.02, 10.40
11.18, 11.55
12.32
13.09, 13.48
14.30
15.12, 15.40
16.26
17.03, 17.40
18.25
19.40
20.30
21.07, 21.44
22.21, 22.58
23.35
0.15

**ад філіяла БДУ**
*субота*
6.35
7.00, 7.25, 7.49
8.14, 8.39
9.03, 9.28
10.04, 10.40
11.18, 11.56
12.33
13.10, 13.47
14.26
15.08, 15.50
16.27
17.04, 17.41
18.21
19.06
20.18
21.08, 21.45
22.22, 22.59
23.36
0.13, 0.53

**ад прыпынку "Вуліца Кірава"**
*нядзеля*
6.00, 6.37
7.14, 7.51
8.28
9.15
10.30
11.07, 11.44
12.21, 12.58
13.35
14.25
15.02, 15.39
16.16, 16.53
17.35
18.50
19.27
20.04, 20.41
21.18
22.00

**ад філіяла БДУ**
*нядзеля*
6.38
7.15, 7.52
8.29
9.06, 9.53
11.08, 11.45
12.22, 12.59
13.36
14.13
15.03, 15.40
16.17, 16.54
17.31
18.13
19.28
20.05, 20.42
21.19, 21.56
22.38

ДАРОЖНЫ РЭПАРТАЖ

# ДРЭЗДЭН: у пошуках гармоніі гучання

Дрэздэн — інтэлектуальная сталіца Германіі. Такім горад быў у час падзелу адной краіны на дзве дзяржавы, такім ён застаецца і сёння. Тут ёсць чым палюбавацца і чым зацікавіць нават самых патрабавальных вандроўнікаў-пілігрымаў. Напэўна, цікава будзе ўведаць той факт, што Дрэздэн падвергся 13 лютага 1945 года, калі ў гэтым ужо не было асаблівай неабходнасці, такой масіраванай бамбёжцы з боку англійскай авіяцыі, што яго разбурэнні склалі 45 %. Помста за тое, што фашысцкія бамбардзіроўшчыкі даляталі да Брытанскіх астравоў і бамбілі гарады на другім баку Ла-Манша, была настолькі адчувальнай, што авіяцыя Вялікабрытаніі каменя на камені не пакідала ад горада. Ды толькі гістарычны цэнтр ягоны быў усё ж хутка адноўлены, а тое, што не да канца зруйнавана, — адбудавана. На старым фундаменце выраслі новыя гмахі. Ці не сімвалічна?

Стаяў сляпучы сонечны жніўеньскі дзень, якія бываюць толькі ў спякотную летнюю задуху, калі мы першы раз за многія і многія гадзіны язды ў турыстычным камфартабельным лайнеры ступілі на тупкі брук, каб пешшу павандраваць па цэнтральнай частцы горада. Тут размешчана былая Каралеўская рэзідэнцыя, дзе сёння Дрэздзенская карцінная галерэя, трапіўшы ў пакоі якой, нечакана слупянееш, убачыўшы яшчэ здалёку — праз дзве-тры залы — у тарцы адной з іх на ўсю сцяну карціну пэндзля геніяльнага Рафаэля дэ Санці "Сікстынская мадонна". А якія іскрыстыя брыльянтавыя кароны, дыядэмы, бранзалеты, ланцужкі захоўваюцца тут пад шклом!

Сцяна аднаго з Каралеўскіх палацаў — велізарнае (метраў сто і болей) панно — мазаічнае палатно, якое выкладзена фарфоравай пліткай з сюжэтамі пра ўладароў Саксоніі за 820 гадоў.

Дрэздэн — сталіца Саксоніі, напамінак пра яго мы сустракаем у летапісах 1206 года: адсюль вазілі соль у Багемію, Чэхію, да якой тут усяго толькі 40 км — пяшком можна да вечара дайсці.

Пешкі мы прайшлі па вуліцы ўздоўж Каралеўскіх кварталаў, спусціліся на вуліцу пад мастом, прайшлі да самай Эльбы. Даволі пампезныя будынкі, пачарнелыя ад часу, узведзеныя з акамянелага пясчаніку і пабудаваныя ў стылі самых розных эпох. Дрэздэнскі драматычны тэатр са статуямі Гётэ, Шылера, Мальера, Шэкспіра, будынак Дрэздэнскай оперы. Адметна, што бываць у Дрэздэнскай оперы апошнім часам стала правілам добрага густу. Прычым, заўважым, збольшага — сярод заходненямецкіх тубыльцаў. Адзначым падобную акалічнасць у пасляінтэграцыйным жыцці Германіі. Багацці духу прываблівають больш, чым матэрыяльны дабрабыт. Дрэздэн абнаўляецца, прыгажэе на вачах. Нават старадаўнія фрэскі "рэстаўруюцца" па найноўшай тэхналогіі. Радуюць вока амаль алоўкавыя, на першы погляд, чорна-белыя лініі роспісу іголкай па чорнай вугальнай масе: белыя па чорным штрыхі партрэтнага і сюжэтнага жывапісу на гарадской сцяне ўражваюць яшчэ здалёку.

...У свой час, да аб'яднання дзвюх частак Германіі, назіраючы за спартыўнымі перамогамі ГДР і ФРГ на спартыўных пляцоўках свету, асабліва на Алімпіядах, мы меркавалі: вось дазволілі б немцам выступаць адной камандай — ім не было б роўных ні ў лёгкай атлетыцы, ні ў зімовых відах спорту, "разносілі" б усіх у пух і прах. А што мы бачым зараз? Няма істотнага якаснага выяўлення складнікаў патэнцыялу дзвюх тэрыторый — ні ў спорце, ні ў культуры, ні ў эканоміцы. Яшчэ цяжэй "складваецца", так бы мовіць, інтэлектуальны багаж. Сума нулёў, як вядома, дае нуль. А сума адзінак, сапраўдных асоб, дае адчувальны патэнцыял. Грамадства, якое складваецца з многіх творчых людзей, з талентаў, мае больш магчымасцей паўплываць на ход гісторыі і часу, здольна ўнесці важкі ўклад у чалавечую цывілізацыю, у развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры. Сёння ў эканоміцы дамінуюць ці, нават можна сказаць, нахрапіста і з выклікам даюць аб сабе адчуць фанабэрыстыя і ўсталяваныя заходнія рынычныя метады. У духоўнай жа сферы прэвалююць усходненямецкія матывы, якія выраслі і ўздымаліся на вялікай усходнеславянскай, найперш рускай, традыцыі, адстойваюць агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці. Сума нулёў дае нуль... Зразумела адно: ідуць настойлівыя пошукі гармоніі гучання абедзвюх мелодый — заходненямецкай утылітарнай, прагматычнай, а таксама ўсходняй — адухоўленай, настраёвай, пачуццёвай, шчырай, сардэчнай.



...На галінцы ліпы над самымі водамі Эльбы, на якой стаіць Дрэздэн, раптам весела заскакала і заціўкала маленькая, з макавае зернейка ў параўнанні з гмахамі і купаламі, крыжамі старадаўніх Каралеўскіх палацаў, птушачка, серабрыстапёрая, з доўгім вяртлявым і вузенькім хвастом, раздвоеным на канцы, якім яна, здавалася нам зверху, з мансарды палаца, абапіралася на ствол маладога дрэўца. Невядома, ці шмат у Дрэздэне паэтаў. Але калі маладая птушачка так хораша заціўкала на галінках ліпы над Эльбай, засвірысцела весела, залівіста, адрывіста, але з хрыпатасцю, дык, я думаю, мелодыя агульнага голасу ў немцаў складзецца. І вельмі хутка.

Спявай, серабрыстая птушачка, над Эльбай, спявай...

*Уладзімір НАВУМОВІЧ,*
*дацэнт,*
*пісьменнік*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*21 лістапада 2002 года*
*Падпісана да друку 20.11.2002*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 1351. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by*